**Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і**
М 54 **літаратуры ў школе і ВНУ**: зб. навук. арт. / пад рэд. І. У. Таяноўскай, Т. В. Мальцэвіч. – Мн.: БДУ, 2006. – Вып. 5. – 110 с.

***В. Ю. Дылеўская, В. У. Праскаловіч, Т. У. Рубанік***

# АСАБЛІВАСЦІ ЎСПРЫМАННЯ ВУЧНЯМІ ТВОРАЎ ЗАРУБЕЖНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Працэс разумення, ацэнкі, суперажывання living рознай інтэнсіўнасці, г. зн. чытацкае ўспрыманне, абумоўлены ідэйна-мастацкай своеасаблівасцю твора айчыннага ці зарубежнага аўтара. Пры гэтым вельмі важным для чытача пры ўспрыманні зарубежнай літаратуры аказваецца своеасаблівае высвечванне ўсеагульнага сэнсу. Улавіць яго на роднай глебе часта бывае складаней, таму што вельмі адчувальна канкрэтна-гістарычнае значэнне твора, веданне сацыяльна-гістарычных умоў яго ўзнікнення. Творы зарубежных аўтараў у школьным курсе вывучаюцца ў кантэксце твораў беларускіх пісьменнікаў. Уключэнне твораў таго ці іншага зарубежнага аўтара ў школьныя праграмы, асаблівасці іх успрымання вучнямі знаходзяцца пад уплывам міжнароднай вядомасці пісьменніка. Шырокая вядомасць і прызнанне творчасці, напрыклад, Байрана, Гейнэ, Дзікенса, Галсуорсі, Міцкевіча і іншых пісьменнікаў садзейнічалі умацаванню іх уплыву на інтарэсы чытача як на радзіме, так і ва ўсім свеце, а таксама больш поўнаму і адэкватнаму ўспраманню іх твораў вучнямі.

Літаратурны твор жыве ва ўсведамленні чытата, праяўляецца ў эмацыянальным і інтэлектуальным уздзеянні на яго. У той жа час аб'ектыўнасць эстэтычнага ўспрымання мастацкага твора заснавана на выяўленні некаторых абавязковых яго якасцей, якія выцякаюць з пэўных прымет мастацкага твора. Гэта ідэйна-мастацкі змест, вобразнасць літаратурнага твора, тыповасць адлюстраваных з'яў і характараў, індывідуальнасць у распрацоўцы тэмы, эмацыянальнасць адлюстравання і своеасаблівасць аўтарскага мыслення, мастацкая праўда адлюстраванага ў творы. Усё гэта спасцігаецца чытачом-школьнікам тым больш не адразу пры непасрэдным успрыманні ў працэсе самастойнага чытання, а становіцца зразумелым у працэсе аналізу, які ажыццяўляецца настаўнікам на ўроку.

Трэба мець на ўвазе і яшчэ адзін бок праблемы ўспрымання: калі аб'ектыўны змест твора прадвызначае правільнае і агульнае для ўсіх разуменне тэкста, то моманты суб'ектыўнага ўспрымання робяць адносіны да твора больш асобаснымі, індывідуальнымі, інтымнымі. І чым паўней зразумелы аб'ектыўны змест твора, тым актыўней і жывей асабістыя эмоцыі, якія дапамагаюць успрыманню літаратурнага твора ў працэсе першаснага знаёмства з ім і наступнага вывучэння пад кіраўніцтвам настаўніка. Успрыманне ў многім вызначаецца псіхалагічнымі асаблівасцямі асобы. Гэтым тлумачыцца мноства адценняў ва ўспрыманні і далейшым тлумачэнні твора мастацтва рознымі людзьмі, але з апорай на аб'ектыўны змест твора. Мера прыбліжэння ўспрымання мастацкага твора да спасціжэння

пісьменніцкай задумы залежыць у першую чаргу ад умення аналітычна і сінтэтычна ўспрымаць твор. І чым слабей гэта ўменне, тым больш суб'ектыўным аказваецца ўяўленне аб ім.

Што перашкаджае эстэтычнаму ўспрыманню любой з'явы мастацкай літаратуры, айчыннай і зарубежнай? Перш за ўсё, вядома, узроставыя, сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці: максімалізм, які ўласцівы юнацкаму ўзросту, недастатковае разуменне канкрэтна-гістарычных умоў, у якіх адбываюцца адлюстраваныя падзеі, недастатковасць жыццёвага вопыту. Адсюль узнікае няправільная трактоўка падзей, прамалінейнасць і адналінейнасць эстэтычных ацэнак, неразуменне ўмоўнасці мастацтва.

Важнейшай умовай адэкватнага ўспрымання мастацкага твора з'яўляецца менавіта ўлік узроставых асаблівасцей вучняў. Так, для падлеткавага ўзросту характэрнае развіццё абстрактнага мыслення і засваенне адцягненых паняццяў адбываецца пры пераважнай увазе да канкрэтна-пачуццёвага, а для ўзросту юнацкага – тыповы інтарэс да праблем тэарэтычна абагульняючага плана і ярка выражаная патрэбнасць знайсці іх самастойнае, асабістае рашэнне. Натуральна, што васьмікласнік бліжэй па ўзроўні свайго развіцця стаіць да сямікласніка, чым да вучня 10 класа, таму гэта градацыя мае істотнае значэнне для настаўніка пры вывучэнні твораў зарубежнай літаратуры, хоць не менш складана вывучэнне ў гэтым узросце твораў айчыннай класікі.

Аднак абмежаванасць успрымання вызначаецца не толькі ўзростам ці жыцёвым івопытам, але і асаблівасцямі самой асобы. Нават вялікі Гётэ прызнаваўся ў абмежаванасці свайго мастацкага ўспрымання, але сцвярджаў магчымасць яго ўдасканалення: "Са мной здаралася і здараецца да гэтага часу, што твор выразнага мастацтва з першага погляду не падабаецца мне таму, што я не дарос да яго; але, калі я спадзяюся мець з гэтага карысць, я стараюся наблізіца да яго, і тады не бывае недахопу ў радасных адкрыццях; я пазнаю ў прадметах новые ўласцівасці, а ў сабе – новыя здольнасці" [1, с. 328].

Пры знаёмстве вучняў з творамі зарубежнай літаратуры новае, незнаёмае можа ўражваць уяўленне менавіта сваёй незразумеласцю, але ў той жа час і не ўспрымацца фактычна. Дапамагчы вучню спасцігнуць змест сусветнай літаратуры, пераадолець натуральнае ў многіх выпадках першаснае неразуменне – важнейшая задача настаўніка.

Вывучэнне канкрэтных узораў зарубежнай класікі пры супастаўленні з творамі айчыннай літаратуры павінна будавацца на аснове паслядоўнага і пераемнага спасціжэння новага, ажыццяўляцца на базе вядомага, знаёмага вучням.

Здольнасць да эстэтычнага ўспрымання фарміруецца толькі ў асабістых зносінах з мастацтвам. Непасрэднае ўздзеянне на фарміраванне эстэтычнага ўспрымання мастацкай літаратуры, у прыватнасці зарубежнай класікі, аперацыя надзвычай складаная, бо закранае пачуцці і ўяўленні, яго актывізацыя цесна звязана з літаратурным развіццём вучня, а таксама з яго чытацкім вопытам. Развіццё культуры чытання, творчага ўяўленння, выхаванне мастацкага густу – усё гэта задачы школьнага вывучэння

літаратуры. Ад таго, у якой ступені школа дапаможа вучню стаць кваліфікаваным, таленавітым чытачом, перш за ўсё залежыць яго здольнасць у далейшым, у пазашкольны перыяд самастойна ўспрымаць і творча перапрацоўваць маральна-эстэтычны зарад мастацкай літаратуры. Гэта асабліва важна, калі размова ідзе аб успрыманні з’яў зарубежнай літаратуры

Успрыманне вучнямі твораў зарубежнай літаратуры базіруецца ў асноўным на агульных заканамернасцях мастацкага ўспрымання, хаця мае і сваю асобую спецыфіку. Характар успрымання вызначаеца актыўнасцю эстэтычных запатрабаванняў. Важнай умовай прадуктыўнага ўспрымання аказваецца актыўнасць усведамлення, г. зн. жаданне і здольнасць вучня саставіць уласнае ўяўленне аб жыцці ўвогуле, крытычна ацаніць розныя ідэі і факты, з якімі ён сутыкаецца ў паўсядзённым існаванні, яго ўменне разгледзець пазітыўнае і негатыўнае.

Школьная праграма, рэкамендацыйны спіс для чытання, зварот да літаратурна-крытычных матэрыялаў у значнай ступені вызначаюць колькасць і якасць мастацкіх твораў для чытання вучняў. Але існуюць і матывы другога плана, якія ўплываюць на выбар, напрыклад, мода, узроставыя асаблівасці чытачоў, спецыфічныя прыметы сацыяльнага мікраасяроддзя і інш. Відавочна, задача школьнага вывучэння ў значнай ступені будзе ў тым, каб паміж нарматыўнай сістэмай мастацкіх запатрабванняў і не рэгламентаваным школай выбарам не было прынцыпова якаснай розніцы, каб мастацкі густ, уменне вызначаць ідэйна-эстэтычную якасць літаратурнага твора, характар сацыяльна-значных пераваг, сфарміраваныя ў працэсе навучання, з’явіліся ў цэлым вызначальнымі для агульнай арыентацыі школьніка ў свеце мастацкага слова. Адсюль сістэма каштоўнасных арыентацый вучняў павінна ўлічваць стыхійную сістэму выбару пры чытанні таго ці іншага твора і на гэтай аснове фарміраваць творчыя адносіны школьніка да ацэнкі літаратурнага твора. Гэта асабліва значна, калі размова ідзе аб зарубежнай літаратуры, уключанай у школьныя праграмы.

Мастацкія творы, якія чытаюць вучні, здольны даць уяўленне аб асаблівасцях мастацкага густу і каштоўнасных арыентацыях. Праведзенае анкетаванне ў сярэдніх школах, гімназіях паказала, што ў цэлым накіраванасць чытання твораў зарубежнай літаратуры вызначаецца цікавасцю да яе "залатога фонду", да тых кніг, якія доўгі час (часта для некалькіх пакаленняў) служаць крыніцай фарміравання чытацкай культуры. Можна меркаваць, што інтарэс да традыцыйна чытаемай зарубежнай літаратуры закладзены не толькі школай, колькі фактарамі другіх сацыяльных уздзеянняў, напрыклад, сямейнае кола чытання, тэлебачанне, кінаэкранізацыі і інш.

Працэс успрымання мастацкага твора характарызуецца ўзаемадзеяннем разумовай і пачуццёвай дзейнасці і сам з’яўляецца крыніцай стабілізацыі ў ацэнцы гэтага твора і шэрагу аналагічных ці падобных літаратурных з’яў. Успрыманне літаратуры – гэта складаны сінтэз інтэлектуальнага і

эмацыянальнага пачаткаў, уключае ў сябе і разуменне твора і адносіны да яго.

Успрыманне, такім чынам, ёсць акт пазнання, перажывання і творчасці. Пры знаёмстве вучняў з творамі зарубежнай літаратуры менавіта гэтыя працэсы вызначаюць характар і сілу ўздзеяння замежнай класікі. У залежнасці ад прыярытэту і інтэнсіўнасці ў працэсе ўспрымання пазнавальнага, эмацыянальнага, аналітычнага ці творчага акцэнту можна гаварыць аб розных тыпах успрымання. П. М. Якабсан [2] вылучае чатыры псіхалагічных тыпы ўспрымання мастацкага твора:

1. Суб'ектыўны, які характарызуецца "жывым перажываннем рознага роду эмоцый".

2. Аб'ектыўны, звязаны з некаторым адхіленнем, першасным значэннем адлюстраванай рэчаіснасці ва ўспрыманні ацэначных меркаванняў.

3. Асацыятыўны, калі творы мастацтва становяцца імпульсам перажыванняў, больш ці менш звязаных з успрымаемым аб'ектам.

4. Экспрэсіўны, калі ўспрымаемы пранікаецца пацуццём у адлюстраванае. Гэты тып характарызуецца пэўнай пачуццёвай незвычайнасцю трактоўкі вобразаў і дэталей.

Пры вывучэнні твораў зарубежнай літаратуры прыймальным для паўнаты маральна-эстэтычнага ўздзеяння з’яўляецца, трэба думаць, спалучэнне аб’ектыўанага і суб’ектыўнага тыпаў успрымання. Работа настаўнікаа павінна дапамагчы вучням скласці правільнае ўяўленне аб літаратурнай з’яве і разам з тым зрабіць яго сваім, асабістым дасягненнем, калі індывідуальнасць успрымання ні ў якім выпадку не будзе мастацкім самавольствам. На наступным этапе работы настаўнік пры ўліку асацыятыўнага тыпу ўспрымання будзе разглядаць літаратурную з’яву зарубежнай класікі ў суаднесенасці са з’явамі айчыннай літаратуры. Экспрэсіўнасць успрымання павінна асабліва праяўляцца пры арганізацыі літаратурна-творчай работы вучняў. Прафесар В. У. Протчанка прапануе: "Добра, калі у ходзе работы над творам настаўнік дапаможа сваім выхаванцам зразумець, што ў мастацкім творы выяўленчыя функцыі выконвае не толькі эмацыянальна афарбаваная, экспрэсіўна насычаная лексіка, але і структура – наяўнасць і будова паэтычных строф, разнастайнасць сінтаксічных канструкцый" [3, с. 139].

Успрыманне твораў зарубежнай (і айчыннай) літаратуры павінна быць, па мажлівасці, "універсальным", г. зн. нараджацца пры ўдзеле ўсяго духоўнага свету школьніка: маральных перакананняў, ідэалаў, уяўленняў аб сваім жыццёвым прызначэнні, эстэтычных пераваг і інш. Толькі пры гэтай умове літаратурны твор акажа ўздзеянне на фарміраванне асобы вучня, на характар яго ідэйных поглядаў, мастацкага густу, паводзін.

***Літаратура***

1. *Гете, И.-В.* Об искусстве: сб./ И.-В. Гете; сост. А.В.Гулыга. – М., 1975.
2. *Якобсон, П. М.* Психология художественного восприятия / П. М. Якобсон. – М., 1964.
3. *Протчанка, В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мн., 2001.